



# ДРАМАТУРГ БЫЎ СВАІМ

***Сваімі ўспамінамі пра У.Сцепчанку і А.Макаёнка падзяліўся ў час свята настаўнік і літаратар з Любані Сцяпан Паўлавіч НЕФІДОВІЧ.***

На яго думку, вёсцы пашанцавала ў тыя гады стаць адным з культурных цэнтраў раёна, куды прыязджалі пісьменнікі, артысты — як з тэатраў, так і эстрадныя (тыя ж «Лявоны», будучыя «Песняры»). А Андрэя Макаёнка ў вёсцы лічылі сваім. І п'еса «Таблетку пад язык», якую ўбачылі вяскоўцы аднымі з першых на Беларусі, — гэта п'еса пра Любань. Многія яе персанажы ўзяты з мясцовага жыцця. І праблемы, што хвалявалі людзей, — урбанізацыя, адток вясковага насельніцтва ў горад — былі выразна і ярка паказаны драматургам.



*Г.Ф.БАЛЬЧЭЎСКАЯ.*